WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
15 КАСТРЫЧНІКА 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 195 (26553)
Кошт 550 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Ці павысяцца мытныя пошліны на ўвоз аўтамабіляў?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАР. 2

# У БЕЛАРУСІ ПАШЫРАНЫ ПРАВЫ АНТЫМАНАПОЛЬНАГА ОРГАНА

**У БЕЛАРУСІ пашыраны правы антыманапольнага органа. Адпаведны ўказ № 499 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні антыманапольнага рэгулявання і развіцці канкурэнцыі» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 13 кастрычніка.**

У дакуменце праведзена размежаванне функцый антыманапольнага органа: на таварных рынках рэспублікі гэтыя функцыі выконвае Міністэрства эканомікі, а на таварных рынках абласцей (г. Мінска) — структурныя падраздзяленні абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў.

Пашыраны правы антыманапольнага органа па спыненні дзеянняў, у тым ліку па адмене не адпаведных заканадаўству прававых актаў, прынятых дзяржаўнымі органамі, аб'яднаннямі юрыдычных асобаў, вынікам якіх можа з'яўляцца абмежаванне канкурэнцыі.

Антыманапольнаму органу таксама прадастаўлена права заключаць пагадненні з юрыдычнымі асобамі, што займаюць дамінуючае становішча на таварных рынках, у якіх вызначаюцца ўмовы іх канкурэнтных паводзінаў, а таксама межы змянення цэнаў (тарыфаў) на тавары (работы, паслугі). Пры гэтым такая юрыдычная асоба выключаецца з Дзяржаўнага рэестра суб'ектаў гаспадарання, якія займаюць дамінуючае становішча на таварных рынках.

Антыманапольны орган надзяляецца правам звароту з іскавымі заявамі ў суды аб прызнанні несапраўднымі дагавораў, якія заключаны ў мэтах парушэння антыманапольнага заканадаўства, прычыняюць шкоду правам і законным інтарэсам іншых юрыдычных асобаў або грамадзян і прыводзяць да абмежавання канкурэнцыі.

Указ уступае ў сілу праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**



# Перапіс у Крамянцы

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У Янушковіцкім сельскім выканкаме Лагойскага раёна прызначаны шэсць перапісчыкаў, адна з іх — жыхарка вёскі Крамянец і староста гэтай вёскі Жанна Майсіевіч. Учора, пачынаючы перапіс насельніцтва, Жанна ў першую чаргу наведала сваіх старэйшых аднавяскоўцаў — сястру і брата Веру і Канстанціна ТОНКАВІЧАЎ (на фотаздымку). Адказваючы на пытанні анкеты, пенсіянеры, у сваю чаргу, папрасілі перапісчыцу данесці да мясцовых уладаў іхнюю даўнюю праблему дрэннага стану вуліцы.**

**— Шмат надзённых пытанняў даводзіцца мне чуць ад жыхароў, — кажа Жанна Віктараўна, — бо людзі хочуць жыць цывілізавана і годна.**

**За дні, адведзеныя дзяржавай для перапісу, Ж. Майсіевіч, акрамя Крамянца, павінна абысці яшчэ дзве вёскі — Бабры і Мышыцы, зайсці ў 90 дамоў, апытаць 230 жыхароў. Несумненна, ёй давядзецца пачуць і нямала просьбаў і пажаданняў. І не толькі ад пенсіянераў. Але такая нялёгкая місія ў вясковага перапісчыка.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ВЫБРАЛІ САМАГА ПРЫГОЖАГА ПАЛІТЫКА



**Прэм'ер-міністр Украіны Юлія Цімашэнка прызнаная самым прыгожым палітыкам. Спіс найпрыгажэйшых кіраўнікоў дзяржаў быў складзены арганізацыяй Hottest Heads of State. У рэйтынг увайшлі 172 палітыкі, сярод якіх ёсць прэзідэнты, прэм'ер-міністры і манархі.**

Ганаровае другое месца заняў прэм'ер-міністр Нарвегіі Енс Столтэнберг, а «бронзу» ўзяў кароль Бутана Джыгме Кхесар Намг'ел Вангчук. На чацвёртым радку рэйтынгу апынуўся прэзідэнт Рэспублікі Конга Джозаф Кабіла. А вось прызнанай прыгажуні, прэм'еру Аргенціны Крысціне Фернандэс дэ Кіршнэр *(на фота справа)*, дастаўся толькі пяты радок чарта. За астатнія месяцы ў спісе барацьба разгарнулася не на жарт. У прыватнасці, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка апярэдзіў прэзідэнта ЗША Барака Абаму, гэтыя палітыкі занялі 12 і 15 месцы адпаведна, расійскі прэм'ер Уладзімір Пуцін апынуўся толькі на 18-м месцы. Нечакана для ўсіх знакаміты дэндзі Прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі трапіў толькі на 28 радок рэйтынгу. Найменш прыгожым кіраўніком прызнаны лідар КНДР Кім Чэн Ір.

### «АРТЭК» У ЦЭНТРЫ СКАНДАЛУ

**Міжнародны дзіцячы цэнтр «Артэк» трапіў у поле зроку Генеральнай пракуратуры Украіны, якая расследуе гучную справу аб згвалтаванні дзяцей у лагеры высокапастаўленымі чыноўнікамі.**

Дэпутат апазіцыйнай Партыі рэгіёнаў у аўторак заявіў аб згвалтаванні дзяцей у «Артэку» нейкімі «прадстаўнікамі ўлады». Нібыта да яго звярталася маці дваіх згвалтаваных там дзяцей, і гэтая інфармацыя пацвердзілася. У справе вельмі шмат няяснасцяў. Па некаторых звестках, да разбэшчвання малалетніх у «Артэку» могуць мець дачыненне высокапастаўленыя ўкраінскія чыноўнікі і нават святар. Першы віцэ-прэм'ер Украіны Аляксандр Турчынаў даручыў кіраўніку МУС Юрыю Луцэнку і міністру па справах сям'і, моладзі і спорту Юрыю Паўленку неадкладна праверыць інфармацыю аб згвалтаванні дзяцей. У сваю чаргу, адміністрацыя «Артэка» аспрэчыла заяву дэпутата.

### НЕМЦАЎ НАПАЛОХАЎ ВОГНЕННЫ ШАР

**Жыхароў поўначы Германіі напалохаў таямнічы вогненны шар, які раптам з'явіўся ў небе, распаўся на часткі і, пакідаючы за сабой вогненны шлейф, пачаў бязгучна падаць на зямлю.**

У нямецкія экстранныя службы звярталіся напалоханыя відавочцы з Гамбурга, Брэмэна і Ніжняй Саксоніі, якія паведамлялі аб «незвычайным мігатлівым шары» або «падпаленым прадмеце на небе». Астраном-аматар Вернэр Вальтар з Цэнтральнага ведамства па даследаванні незвычайных нябесных феноменаў выказаў здагадку, што гэта была буйная знічка, якая згарэла ў шчыльных пластах атмасферы Зямлі. Раней «вогненны шар» назіралі ў небе над Канадай.

Ва Урадзе

# БЕЛАРУСЬ У ЦЭЛЫМ ГАТОВАЯ ДА АЦЯПЛЯЛЬНАГА СЕЗОНА

**заявіў першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, на якім разглядалася пытанне гатоўнасці народнай гаспадаркі да працы ў асенне-зімовы перыяд 2009/2010 года. Паводле звестак на 13 кастрычніка, цяпло ў рэспубліцы атрымалі 91 працэнт спажыўцоў. Прычым у Віцебскай і Магілёўскай абласцях спажыўцы падключаны да цеплавой энергіі на 100 працэнтаў. Разам з тым, у Мінскай вобласці гэты паказчык склаў 99 працэнтаў, у Гомельскай і Гродзенскай — адпаведна 93 і 94, у Брэсцкай — 72. Незразумела чаму, але ў Мінску цяплом забяспечаныя толькі 80 працэнтаў спажыўцоў. Акрамя таго, насцярожвае і інфармацыя, што пакуль няма ўсіх пашпартоў гатоўнасці спажыўцоў і крыніц. Уладзімір Сямашка запатрабаваў да пачатку ацяпляльнага сезона выканаць усе работы і рэгламенты, асабліва па цепла- і энергакрыніцах. «Работы павінны быць закончаны за 1-3 дні», — зазначыў ён.**

Намеснік міністра эканомікі Анатоль Філонаў праінфармаваў, што запасы топачнага мазуту на пачатак кастрычніка ў цэлым па краіне склалі больш за 561 тысячу тон, ці 114,2 працэнта да задання, даведзенага асноўным арганізацыям спажыўцам. У прыватнасці, арганізацыі сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі назапасілі гэтага паліва ў аб'ёме каля 46 тысяч тон, што складае больш за 182 працэнты да задання. Паліўных брыкетаў сёлета выраблена 110 працэнтаў да адпаведнага леташняга перыяду. Паводле слоў Анатоля Філонава, каб павысіць надзейнасць газазабеспячэння рэспублікі, былі распрацаваныя мерапрыемствы і графікі запампоўвання прыроднага газу ў міжацяпляльны сезон у падземныя газасховішчы ў максімальна магчымых па тэхнічных параметрах аб'ёмах. На 8 кастрычніка створаныя ў сховішчах запасы склалі 600,7 мільёна кубаметраў, альбо 75 працэнтаў ад задання.

Заканчваюцца на месцах і працы па замене цеплавых сетак, якія забяспечваюць цеплазабеспячэнне жыллёвага фонду і аб'ектаў сацыяльнай сферы. На думку намесніка міністра, у цэлым па краіне зроблена шмат пры падрыхтоўцы да ацяпляльнага перыяду. Аднак ёсць і незакрытыя пытанні, у прыватнасці, згаданае адставанне па афармленні пашпартоў: на 8 кастрычніка органамі Дзяржэнерганагляда зарэгістравана 17 тысяч 998 пашпартоў гатоўнасці спажыўцоў і цеплакрыніц, што складае 86,7 працэнта ад задання. Каб ліквідаваць усе недахопы, арганізацыям дадзены час да 20 кастрычніка.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

АУКЦИОН

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЕЛОМО – ММЗ ИМЕНИ С.И. ВАВИЛОВА»
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже **складского комплекса, расположенного в Минском районе, промузел «Колодищи» в составе: 1)** Здание арочного складского помещения № 5, 679,5 кв.м; **2)** Здание арочного склада № 8, 697,5 кв.м.; **3)** Здание арочного склада № 6, 373,3 кв.м; **4)** Здание склада, 652,8 кв.м; **5)** Здание котельной, 251,7 кв.м; **6)** Здание проходной, 36,6 кв.м; **7)** Здание сборно-щитового домика, 58,4 кв.м; **8)** Здание склада цемента и мела, 33,9 кв.м; **9)** Здание склада, 4316,5 кв.м; **10)** Здания блока металлических складов, 324,5 кв.м; 326,3 кв.м; **11)** Здание металлического склада, 68,2 кв.м; **12)** Здание склада древесного пека, 54,8 кв.м; **13)** Здание автовесов, 25,2 кв.м; **14)** Здание трансформаторной подстанции, 117,7 кв.м; **15)** Здание насосной станции, 57,5 кв.м; **16)** Здание блока складских помещений, 844,7 кв.м; **17)** Здания складов, 141,0 кв.м; 184,9 кв.м; 240,5 кв.м; 258,4 кв.м; **18)** Пристройка к сборно-щитовому домику, 70,5 кв.м; а также **сооружений и оборудования. Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 8 079 611 394 бел. руб. Площадь земельного участка – 7,9748 га.** Задаток – 500 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.05.2009 г. Аукцион состоится **17.11.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.11.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

## УВАГА — ІЛЖЭГАЗАВІКІ!

**У Мінску невядомыя, называючыся супрацоўнікамі сацыяльных або аварыйных службаў, заходзяць у кватэры і ўчыняюць крадзяжы грошай і каштоўнасцяў. Серыя такіх злачынстваў зарэгістравана ў Савецкім раёне.**

Як паведаміў начальнік аддзела крымінальнага вышуку Савецкага РУУС Васіль Найдзёнка, апошні выпадак адбыўся 12 кастрычніка. Двое зламыснікаў пад выглядам работнікаў прадпрыемства «Мінгаз» увайшлі ў кватэру пенсіянеркі на праспекце Незалежнасці і выкралі 160 тысяч рублёў. Часцей за ўсё зладзеі называюць сябе работнікамі ЖРЭА, службы сацыяльнай абароны, а таксама адміністрацыі раёна. Васіль Найдзёнка раіць грамадзянам не ўпускаць у дом незнаёмых людзей, званіць у сацыяльныя або аварыйныя службы і ўдакладняць, ці накіроўвалі яны спецыялістаў, у тых, хто прыйшоў, патрабаваць дакументы.

**Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА, «Мінск—Навіны».**

БЕЛИНВЕСТБАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 224 956,9 | 185 838,0 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 | 109 800,5 | 268 542,4 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | | 300 264,5 | 307 526,7 |
| | для торговли | 11031 | 3 | – | – |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 3.1 | 15 038,3 | 33 033,9 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 3.2 | 285 226,2 | 274 492,8 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | 374 184,7 | 209 168,1 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 3 379 393,5 | 2 900 717,1 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | 427,0 | 426,9 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | 219 234,4 | 160 512,8 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | 84 973,8 | 67 885,5 |
| **10** | **Итого активы** | **110** | | **4 693 235,3** | **4 100 617,5** |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 9 | 376 353,8 | 120 380,9 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | 337 676,7 | 398 167,8 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | 3 092 091,3 | 3 105 074,4 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | 154 929,0 | 24 340,7 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | 74 816,8 | 63 710,8 |
| **17** | **Всего обязательства** | **120** | | **4 035 867,6** | **3 711 674,6** |
| 18 | КАПИТАЛ | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | 382 089,6 | 182 089,6 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | 0,1 | 0,1 |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 33 857,6 | 28 357,6 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | 153 036,9 | 113 917,4 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | 88 383,5 | 64 578,2 |
| 24 | Всего капитал | 121 | | 657 367,7 | 388 942,9 |
| **25** | **Итого обязательства и капитал** | **12** | | **4 693 235,3** | **4 100 617,5** |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | 3 361 273,6 | 2 099 630,2 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | 918 917,5 | 680 377,6 |

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2009 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 438 334,4 | 255 449,0 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 311 593,8 | 170 538,8 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 18 | 126 740,6 | 84 910,2 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 87 899,6 | 85 593,5 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 11 986,1 | 9 380,6 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 | 75 913,5 | 76 212,9 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20 | (-14016,8) | 37 943,6 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 21 | (-292,0) | (-112,5) |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | 40,1 | 35,5 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 22 | 31 848,6 | 3 818,8 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 23 | 84 802,6 | 11 375,4 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 | 147 207,7 | 128 142,7 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 25 | 36 397,8 | 17 460,2 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 9 425,4 | 14 857,5 |
| 15 | Прибыль (убыток) | 2 | | 48 308,5 | 46 085,9 |

Заместитель Председателя Правления — Т.А. Новосельская
Главный бухгалтер — А.Н. Сырокваш

www.belinvestbank.by
*Минск, пр-т Машерова, 29*

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» УНП 807000028
Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 3 от 27.10.2006 г.

## ХАБАР — ПА-РАНЕЙШАМУ САМЫ РАСПАЎСЮДЖАНЫ ВІД КАРУПЦЫІ

**А самая карумпаваная сфера дзейнасці — гандаль. Аб гэтым учора ў Нацыянальным прэс-цэнтры паведаміў намеснік Генеральнага пракурора Беларусі Віктар Конан. Яго прэс-канферэнцыя была прысвечана тэме супрацьдзеяння карупцыі органаў пракуратуры нашай краіны.**

Намеснік Генеральнага пракурора адзначыў вострую неабходнасць утаймавання карупцыі, якая мае высокую ступень латэнтнасці, ці, інакш кажучы, носіць схаваны характар, а таму ўвогуле складаная для выяўлення і раскрыцця.

СТАР. 2

## З РЫНКУ «ЗАХОДНІ» ЭВАКУЯВАЛІ ЛЮДЗЕЙ

**Учора наведвальнікам і гандлярам давялося тэрмінова пакідаць тэрыторыю сталічнага рынку «Заходні»: тут працавалі дзве групы размініравання, шукаючы падазроныя выбухованебяспечныя прадметы.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, эвакуацыя людзей была праведзеная ў сераду пасля званка невядомай жанчыны. Апошняя а палове адзінаццатай дня патэлефанавала на спецлінію «102» і паведаміла, што з 12.30 да 13 гадзін на «Заходнім» адбудзецца тэрарыстычны акт. Калі ж аператар паспрабавала высветліць асобу невядомай, яна са словамі: «Не магу сябе назваць, баюся, што заб'юць» павесіла трубку.

Як высветлілася пасля дэталёвага абследавання тэрыторыі, «мін» на рынку не было. Праваахоўнікамі вызначана, што невядомая тэлефанавала з таксафона, які размешчаны на тэрыторыі «Заходняга». Цяпер супрацоўнікі міліцыі вядуць пошук гэтай «жартаўніцы».

**Ігар ГРЫШЫН.**

ISSN 1990 - 763X

# МОКРАЕ ЗОЛАТА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На мінскай вуліцы.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ЧПТУП «НЕСВИЖ КООПЗАГОТПРОМ» (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже объектов недвижимости, расположенных по адресу: г. Несвиж, ул. Ленинская, 126, в составе: здания свинарника, об. пл. 1028,7 кв.м; здания летнего лагеря для свиней, об. пл. 720,6 кв.м; здания летнего лагеря для свиней, об. пл. 254,8 кв.м. Начальная цена с НДС – 437 306 820 бел. руб. Площадь земельного участка 1,6667 га. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **18.11.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.11.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЕЛЭНЕРГОРЕМНАЛАДКА» (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже объектов недвижимости, расположенных по адресу: Минская область, Вилейский район, д. Камено, в составе: здание столовой, об.пл. 351,5 кв.м; здание бани-прачечной, об. пл. 315,5 кв.м. Начальная цена с НДС – 286 498 317 бел. руб. Земельный участок для обслуживания объектов недвижимости будет выделен из земельного участка об. пл. 5,2061 га. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **17.11.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.11.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

# Расійскі АДЭ для беларусаў — не абавязковы

**У НАСТУПНЫМ годзе ў грамадзян Беларусі, якія плануюць паступаць у расійскія ВНУ, будзе магчымасць выбару формы ўступных іспытаў. Аб гэтым беларускім журналістам паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры намеснік міністра адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі Уладзімір Фрыдлянаў, які прымае ўдзел у навукова-практычнай канферэнцыі «Стан і праблемы развіцця вышэйшай адукацыі ў рамках Саюзнай дзяржавы».**

Варта нагадаць, што з 2009 года адзіны дзяржаўны экзамен стаў у Расіі абавязковай формай выніковай атэстацыі за курс сярэдняй школы і прыёму ў ВНУ. Аднак абітурыентам з Беларусі была дадзена магчымасць здаваць у гэтым годзе ўступныя іспыты непасрэдна ў расійскіх ВНУ або, калі яны пажадаюць, здаваць адзіны дзяржаўны экзамен разам з расіянамі. Паколькі тэрміны правядзення АДЭ ў Расіі супадаюць з выпускнымі экзаменамі ў беларускіх школах, гэта магчымасць выбару мела для беларусаў важнае значэнне. «Такая ж магчымасць будзе ў беларускіх юнакоў і дзяўчат, якія адважацца штурмаваць расійскія ВНУ, і ў будучым годзе», — запэўніў Уладзімір Фрыдлянаў.

Аднак з беларускага боку такога «рэверансу» ў бок расіянаў не чакаецца. Тэрміны правядзення цэнтралізаванага тэсціравання ў Беларусі таксама вельмі нязручныя для выпускнікоў расійскіх школ, якія ў гэты час заклапочаныя сваімі выпускнымі іспытамі.

— І для беларусаў, і для расіян у нас дзейнічаюць агульныя правілы гульні: конкурсны адбор ажыццяўляецца на падставе вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання. І расійскія грамадзяне, якія праходзяць па конкурсе, карыстаюцца тымі ж правамі, што і беларусы: яны залічваюцца на бюджэтную форму навучання і могуць прэтэндаваць на месца ў інтэрнаце і стыпендыяльнае забеспячэнне, — падкрэсліў у сваім выступленні **міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр РАДЗЬКОЎ.** — Па нашых назіраннях, тэрміны правядзення цэнтралізаванага тэсціравання не зменшылі колькасць расійскіх грамадзян, якія паступаюць у беларускія ВНУ. Так, калі ў 2008/2009 навучальным годзе ў беларускіх ВНУ навучаліся 1846 грамадзян Расійскай Федэрацыі, то ў гэтым годзе іх колькасць перавысіла 2 тысячы чалавек. Толькі ў ВНУ Міністэрства адукацыі ў 2009 годзе на першы курс паступілі 310 чалавек, з іх на бюджэтныя месцы на дзённую форму навучання паступілі 94 чалавекі (у 2008 годзе — 57), на ўмовах аплаты паступілі 146 грамадзян Расіі (у 2008 годзе — 153 чалавекі) і 70 расійскіх грамадзян паступілі ў ВНУ Міністэрства адукацыі на завочнае навучанне.

У перспектыве, калі будзе добра адпрацаваная працэдура правядзення адзінага дзяржаўнага экзамену, кіраўнікі расійскага і беларускага адукацыйных ведамстваў не выключаюць магчымасць арганізацыі для беларускіх грамадзян АДЭ, а для расіян — цэнтралізаванага тэсціравання ў памежных раёнах дзвюх нашых краін. А вось прызнанне ў Расіі вынікаў беларускага ЦТ, як і прызнанне ў Беларусі вынікаў адзінага дзяржаўнага экзамену — даволі малаверагодная перспектыва, хоць бы таму, што кантрольна-вымяральныя матэрыялы АДЭ і ЦТ адрозніваюцца не толькі па сваім прызначэнні, але і па змесце, структуры і складанасці. Гэтыя адрозненні ўскладняюцца яшчэ і розніцай у адукацыйных стандартах і змесце вучэбных праграм па прадметах. Вынікі выканання адзінага дзяржаўнага экзамену і ЦТ ацэньваюцца па 100-бальнай шкале, але пры гэтым яны не раўназначныя, паколькі атрыманыя на прынцыпова розных метадах падліку. Таму ўзровень абітурыента, які атрымаў, скажам, 70 балаў па выніках АДЭ, не роўны ўзроўню падрыхтоўкі ўдзельніка ЦТ, які набраў такую ж колькасць балаў.

Аляксандр Радзькоў таксама паведаміў, што ў гэтым годзе ў рамках праграмы супрацоўніцтва міністэрстваў адукацыі Беларусі і Расіі расіяне далі магчымасць адабраць 50 беларускіх абітурыентаў, якія не прайшлі ў нас па конкурсе, для іх далейшага навучання ў расійскіх ВНУ на бюджэтнай аснове з выдзяленнем жылля ў студэнцкіх інтэрнатах і выплатай стыпендыі. Прычым размова ішла не толькі пра рэгіянальныя ВНУ, але і пра прэстыжныя спецыяльнасці ў ВНУ расійскай сталіцы і Санкт-Пецярбурга. Аднак дастатковай колькасці ахвотных не набралася. Абітурыенты і іх сем'і зрабілі выбар на карысць платнага навучання ў беларускіх ВНУ, палічыўшы, што гэта ўсё адно будзе больш танна, чым пражыванне ў Маскве ці ў паўночнай расійскай сталіцы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

На слыху

# Кошты на аўтамабілі зробяцца непад'ёмнымі?



**Кажуць, размытнёўка на машыны можа вырасці ў разы, калі з новага года Беларусь разам з Казахстанам і Расіяй стане ўдзельніцай Мытнага саюза. Але «хапуна» на беларускім рынку б/к аўтамабіляў пакуль няма. Можа быць, размовы пра падаражэнне — гэта лішняя паніка?**
**Карэспандэнт «Звязды» разбіраўся, што адбываецца з коштамі на машыны і якіх зменаў на аўтарынку нам чакаць у найбліжэйшы час.**

## МАШЫНЫ НЕ ДАРАЖЭЮЦЬ НАСУПЕРАК ЛОГІЦЫ

Здавалася б, што з-за размоў пра адзіную мытную прастору беларусы павінны кінуцца набываць машыны. Калі ў Беларусі размытнёўка на аўто зробіцца такой жа, як у Расіі, то кошты падскочаць на тысячы долараў, а то і ў разы. Па ідэі, у аўтааматараў застаецца два месяцы, каб набыць больш-менш танную машыну.

Карэспандэнт «Звязды» наведаўся на аўтарынкі, каб даследаваць, ці пачаліся падаражэнні напярэдадні Новага года. А таксама прагартаў рэкламныя газеты з прапановамі набыць аўто і прыцаніўся да абвестак на інтэрнэт-сайтах.

У жніўні я сам прадаў сваё «Рэно Кліа» 2000 года выпуску за 3500 долараў ЗША. Сёння такое ж аўто прапаноўваюць у сярэднім за 3700 долараў. Але прадаўцы гатовыя скінуць сотню-другую, калі пагодзішся набыць машыну. Падобная сітуацыя і па іншых малалітражках — кошты амаль не падняліся.

Замест «Рэно Кліа» ў жніўні набыў сабе эканамічны турбадызельны «Нісан Альмера» 2004 года выпуску — усяго за 7000 долараў. Трэба сказаць, што яшчэ год таму такая машына каштавала больш за 11 000 долараў.

Днямі на аўтарынку знайшоў такую ж «Альмеру» за 7300 долараў. З улікам магчымай зніжкі — падаражэнне зноў жа нязначнае.

Папулярнае ў народзе турбадызельнае «Пежо-406» 2000 года выпуску каштуе сёння ад 5200 «зялёных» (белага колеру з праблемным рухавіком ) да 7000. Такія кошты на «Пежо-406» трымаюцца ўжо доўгія месяцы.

— Цэннік калі і вырас, то гэта сезоннае павышэнне коштаў, так было заўсёды, — тлумачыць прафесійны перагоншчык Андрэй Вазераў. — Людзі не бяруць больш машын, хоць ужо даўно можна было пасівець ад чутак пра павышэнне размытнёўкі. Ды і чуткі такія ходзяць кожны год.

Яшчэ адзін прафесійны перагоншчык Максім распавёў, што некаторыя яго калегі ўжо сёння сыходзяць з рынку.

— Хлопцы панабіралі машын, а прадаць іх не могуць, — з мацюкамі і адчаем у голасе жаліцца перагоншчык Максім. — Людзі не купляюць. Нядаўна прадаў машыну сабе ў мінус, уяўляеш? А калі ўвядуць новую размытнёўку, то ўсё — пусцімся жабракамі па белым свеце!..

## ЯКІЯ КОШТЫ НА Б/У АЎТО МОГУЦЬ НАС ЧАКАЦЬ?

**Калі сёння ў Беларусі аўтамабіль з аб'ёмам рухавіка ў 2000 кубічных сантыметраў 2000 года выпуску вы купіце за 6000 долараў (напрыклад, тое ж «Пежо-406»), то кошт такой машыны з размытнёўкай у Расіі будзе аж 16 800 «зялёных».**

**Адкуль такая вялізная разбежка? Прычына ў тым, што мытныя пошліны на ўвоз замежных аўто ў Беларусі і Расіі адрозніваюцца як неба і зямля.**

**Расія ў крызісныя часы абараняе ўласны аўтапрам. Размытнёўка ўзгаданай «Пежо-406» у суседзяў каштуе каля 12 тысяч долараў (4 еўра за кубічны сантыметр). Беларуская размытнёўка за такое аўто ў дзесяць (!) разоў меншая —1200 долараў ЗША (0,4 еўра за кубічны сантыметр). Яно і зразумела, легкавікі ў нас выпускаюцца ў невялікай колькасці, абараняць няма чаго.**

**Калі размытнёўка аўтамабіляў у Беларусі стане такой жа высокай, як у Расіі, то рынкі і былых у карыстанні, і новых аўто ляснуцца.**

## ЭКСПЕРТ: «ПАСЛЯ НОВАГА ГОДА РАЗМЫТНЁЎКА МОЖА НЕ ЗМЯНІЦЦА»

Нават у выхадныя дні «хапуна» на папулярным народным аўтарынку я не пабачыў. **«Няўжо размытнёўка не павысіцца?»** — запытаўся карэспандэнт «Звязды» ў **аўтарытэтнага аўтаэксперта Анатоля ШАЎЧЭНКІ, прэзідэнта Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі.**

*— «Залаты запас» у нашых людзей вычарпаны, а тыя, што маюць грошы, укладаюць іх сёння не ў аўтамабілі, а ў нерухомасць, — лічыць Анатоль Шаўчэнка. — Крэдыты людзі бяруць неахвотна, бо многія апошнім часам на гэтым апякліся.*

*Перагоншчыкі спрабавалі гуляць на размовах пра павелічэнне размытнёўкі. Гэта лагічна: павялічыцца размытнёўка — істотна павялічацца кошты. І застаецца апошні шанц набыць аўто за прымальныя грошы. Але штучнае завышэнне коштаў не спрацавала. Ды і пытанне адзінай мытнай прасторы застаецца адкрытым. У дыялогу з Расіяй у нас пакуль хапае супярэчнасцяў. Па заключэннях афіцыйных крыніц, падаражэнне аўтамабіляў пасля Новага года наўрад ці адбудзецца. Хоць ніхто не сцвярджае гэта на 100 працэнтаў.*

Што будзе з Мытным саюзам (Беларусь, Расія, Казахстан), і сапраўды пакуль незразумела. Праект новага Мытнага кодэкса падрыхтаваны, адзіныя мытныя тарыфы амаль узгодненыя. Толькі якой будзе размытнёўка на аўтамабілі, чыноўнікі пакуль не паведамляюць.

Цэльнай выглядае ідэя ўступлення Мытнага саюза ў Сусветную гандлёвую арганізацыю (СГА), і гэта асноўная мэта. Але падобных прэцэдэнтаў уступлення ў СГА яшчэ не было, таму пытанняў застаецца шмат. Многае стане зразумелым у ліпені, калі ў Мінску плануюць падпісаць Мытны кодэкс краін — сяброў Мытнага саюза.

**Яўген ВАЛОШЫН.**

### ПОГЛЯД ЗБОКУ

Увядзенне ў Беларусі «расійскай» размытнёўкі пакуль выклікае сумневы. Беларусам гэта нявыгадна — аўтамабілі па новых коштах немагчыма будзе набыць. Ёсць яшчэ адзін аргумент супраць павышэння размытнёўкі. Калі мытная прастора зробіцца адзінай, расіяне кінуцца выкупляць танны па іх мерках беларускі «аўтахлам». Зноў жа аўтапрам суседзяў будзе пад пагрозай.

Але гарантаваць тое, што размытнёўка на аўто ў нас не павялічыцца, ніхто не можа.

Лепш перастрахавацца і ўсё ж выбраць б/к аўтамабіль у найбліжэйшы час. Відавочна, што кошты не зробяцца меншымі, іначай перагоншчыкам няма сэнсу працаваць — нявыгадна. А вы, калі размытнёўка раптоўна павялічыцца, пасля Новага года не будзеце шакіраваныя новымі «атамнымі» коштамі, .

### НАЎЗДАГОН

*Калі артыкул рыхтаваўся да друку, стала вядома пра тое, што Мытны кодэкс Беларусі, Расіі і Казахстана павінен запрацаваць д**а першага ліпеня 2010 года.** Пра гэта паведаміў падчас адкрыцця пасяджэнняў трох камісій ЕўрАзЭС у Мінску першы намеснік міністра замежных спраў Беларусі Ігар Петрышэнка.*

*Такім чынам, да першага студзеня новага года ўніфікаваць новыя мытныя пошліны, відаць, не паспеюць. А значыць, размытнёўка, аўтамабіляў так хутка не падаражэе.*

*Дакладная дата, калі Мытны кодэкс запрацуе, пакуль невядомая.*

## Абзац

**◢ Моцны вецер уначы і раніцай 14 кастрычніка пакінуў без электраэнергіі населеныя пункты ў чатырох абласцях Беларусі. У выніку моцных парываў былі абясточаныя 687 населеных пунктаў у Брэсцкай, Гродзенскай, Мінскай і Віцебскай абласцях. У пераважнай большасці гэта вёскі. На ліквідацыі наступстваў разгулу стыхіі працуюць больш за 500 спецыялістаў.**

◢ У Жлобінскім і Мазырскім раёнах за адны суткі выпала месячная норма ападкаў. Рэкорднае значэнне за ўсю гісторыю метэаназіранняў зарэгістравана ў гэты час года ў Жлобіне — 50 мм. Ліўневыя дажджы прывялі тут да падтаплення прыватных падворкаў. У Гомелі, Чачэрску, Акцябрскім і Мазырскім раёнах выпала ад 16 мм і вышэй.

**◢ Былы дырэктар гандлёвага дома «Ждановічы» Яўген Шыгалаў поўнасцю кампенсаваў прычынены дзяржаве ўрон, адзначана ўчора на прэс-канферэнцыі ў Мінску. Сума склала Br85 млрд.**

◢ Класічная камп'ютарная галаваломка тэтрыс — добры спосаб палепшыць разумовыя здольнасці. Да такой высновы прыйшлі навукоўцы з Mind Research Network, якія вывучалі ўплыў гульні на мозг чалавека. Даследаванне доўжылася тры месяцы, у ім удзельнічала некалькі дзяўчат, якія гулялі ў тэтрыс пэўны час штодзень. У канцы даследавання мозг дзяўчат дэманстраваў прыкметна павялічаную разумовую актыўнасць. У іх палепшыліся якасці планавання, развілося крытычнае мысленне, хуткае разумовае рэагаванне. Больш за тое, выявілася, што тэтрыс здольны павялічваць памеры мозгу. Гульня адзначае сёлета сваё 25-годдзе. Яе прыдумаў савецкі навуковец Аляксей Пажытнаў, які потым пераехаў у ЗША.

## Поўны абзац

**◢ На аўкцыёне Sotheby's пастаўлены новы рэкорд. Бутэльку ўнікальнага французскага віна «Шато Петрус» ураджаю 1982 года набыў пакупнік з Кітая. За 6-літровую ёмістасць разгарэлася ўпартая барацьба паміж некалькімі прэтэндэнтамі. У выніку жыхар Кітая купіў бутэльку віна за 94 тыс. долараў. Аўкцыён прайшоў у Ганконгу.**

◢ Незвычайны выкрадальнік аўтамабіляў быў затрыманы міліцыянерамі на поўначы Масквы. У дзяжурную часць УУС паступіла паведамленне аб тым, што ад аднаго з дамоў укралі... маршрутнае таксі. Як вызначыла следства, вадзіцель мікрааўтобуса Hyundai County на канцавым прыпынку адлучыўся, забыўшы пры гэтым зачыніць дзверцы і дастаць ключы запальвання. Гэтым скарыстаўся 27-гадовы мужчына. Украўшы машыну, ён па дарозе пасадзіў у салон дваіх пасажыраў і, атрымаўшы ад іх па 20 рублёў за праезд, пагадзіўся адвезці іх да станцыі метро. Неўзабаве аўтамабіль быў выяўлены, а злодзей затрыманы. Супраць яго распачатая крымінальная справа.

**◢ У Закарпацці школьнікі скралі са сталоўкі сокі, пячэнне і алей. Невядомыя залезлі ў школьную сталоўку праз адчыненае акно. У хуткім часе па падазрэнні ў крадзяжы міліцыя затрымала чатырох вучняў гэтай школы ва ўзросце 11-14 гадоў, у тым ліку і 11-гадовую дзяўчынку. Выявілася, што пячэнне і сок маладыя зладзеі з'елі, а алей вартавыя парадку паспелі канфіскаваць.**

◢ У Марыупалі банкамат памылкова выдаў пенсіянеру 12 пенсій замест адной, і дзядуля не мае намеру іх вяртаць. Спецыялісты па абслугоўванні банкамата сцвярджаюць, што падобныя «прыколы» з банкаматам здараюцца вельмі рэдка, таму знайсці «ахвяру» такой памылкі для банка нескладана. Вось тры патэнцыйныя прычыны, па якіх гэта магло адбыцца: на картку пенсіянера маглі пералічыць памылковую суму; банкамат няправільна запраграмавалі; у апарат былі загружаныя не тыя банкноты. У любым выпадку атрымальнік грошай лічыць іх сваімі і не спяшаецца развітвацца з купюрамі.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## «ТАБЛІЦА МЕНДЗЯЛЕЕВА»

ва ўзорах была знойдзена ў аўтамашыне «МАЗ» на аўтадарозе «Крычаў-Бабруйск-Іванцэвічы» каля вёскі Доўск у Рагачоўскім раёне: 3 569 кг нержавеючай сталі, 656 кг медзі, 904 кг свінцу, 2 740 кг алюмінію, 677 кг латуні. Усяго 8,5 тысячы кілаграмаў каляровых металаў, і ўсё — без неабходных дакументаў. Каштоўнае аўто затрымана разам з грузам для праверкі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
### по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

| Наименование предмета аукциона | Здание овощехранилища и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | г. Брест, ул. Я. Купалы, 6/1 |
| Продавец недвижимого имущества | Концерн «Беллегпром» (в лице ОАО «Брестский чулочный комбинат») тел. 80172 00 31 41, 80162 46 62 62 |
| Сведения о предмете аукциона | Здание 1968 г.п., площадь – 80,1 кв.м. Земельный участок площадью 0,0438 га, для размещения объекта производственно-складского назначения, срок аренды – 5 лет |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 32 811 517 |
| Сумма задатка, руб. | 3 280 000 |
| Реквизиты счета для перечисления задатка | **р/с 3642902530005 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538, срок внесения – по 26.10.2009 г. включительно** |
| Организатор аукциона | **Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 20 87 85, 23 12 63, www.brest-region.by** |

Аукцион состоится **27 октября 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Более подробная информация об участии в аукционе опубликована в газете «Звязда» от 03.09.2009 № 165.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 26 октября 2009 года включительно.**


Наш фармат

# «Хай заўжды будзе мама, хай заўжды буду я!»



Калі аловак не слухаецца, лепш маляваць удваіх.

**У ЧОРА ў Нацыянальнай бібліятэцы нязвыкла звінелі дзіцячыя галасы. Тут адбывалася творчая майстэрня, прымеркаваная да Дня маці — конкурс дзіцячага малюнка «Добрае сэрца маёй мамы».**

Жарабяты, лебедзі, вазы з кветкамі, сонца з аблокамі і, натуральна, мноства сэрцаў і сэрцайкаў. 4 дзясяткі дзяцей з любоўю расфарбоўвалі каляровымі алоўкамі свае падарункі — адны па-дзіцячы кранальныя, іншыя хоць зараз на выставу. Іра Грыгор'ева ўзялася за матулін партрэт, Паліна Куляшова малявала пейзаж, на якім усміхаліся ўсе — і чалавечак, і дом, і кветкі.

А вось у дзяцей Вольгі Кіцікавай нацюрморт меў калектыўнае аўтарства. Што не дзіўна, калі за яго па чарзе браліся чатыры мастакі. Усяго ж у сям'і 10 дзяцей — самаму малодшаму, Мішу, 4 гады, старэйшаму, Антону — 13, і ўсе таленавітыя па-свойму: адным больш падабаецца маляваць, іншыя добра танчаць і з'яўляюцца завадатарамі на сямейных дыскатэках.

На агульнае паважлівае здзіўленне: «Няўжо не страшна было вырашыцца ў наш час выхоўваць 10 дзяцей?» — Вольга толькі стрымана ўсміхаецца:

— Сваіх у мяне ўсяго трое, астатнія сямёра — прыёмныя, мы ўзялі іх з розных дзіцячых дамоў. — Пасля дадае: — Мо, на першага вырашыцца і страшнавата, а пасля трох — ужо не, так што спрабуйце!

Раней, прызнаецца Вольга, яна і не падазравала, колькі ў Беларусі кінутых дзяцей. А потым убачыла — і не змагла застацца ўбаку. «Чула, што плануецца паступова расфарміроўваць дзіцячыя дамы, аддаючы дзяцей у прыёмныя сем'і. Калі дзяржава сапраўды гэтым зоймецца, то, лічу, прыёмным сем'ям патрэбна большая дапамога — нават не столькі грашовая, колькі ўвага і падтрымка з боку дзяржавы».

...Хто перамог у конкурсе малюнка, спытаеце вы? Мамы, якім з вялікай любоўю былі прысвечаны ўсе мастацкія творы. І, безумоўна, усе маленькія жывапісцы, для якіх была падрыхтавана адмысловая музычна-забаўляльная праграма ды падарункі. Арганізатарамі акцыі выступілі гандлёвая марка «Анежкі» і валанцёрскі рух «Добрае сэрца», якія падарылі свята 14 шматдзетным сем'ям. Можа, было яно не звышмаштабным, але затое цёплым і па-сапраўднаму сямейным.

«Я сама мама і ўпэўнена, што жанчына становіцца па-сапраўднаму жанчынай толькі пасля нараджэння дзіцяці. Жыццё робіцца вельмі сумным, калі няма каму назваць цябе мамай, — перакананa кіраўнік валанцёрскага руху «Добрае сэрца» Варвара Александровіч. — І яшчэ хачу звярнуцца ў гэты дзень да дзяцей, вялікіх і маленькіх: беражыце вашых мам, любіце іх, гаварыце ім пра гэта і цаніце кожны дзень, пражыты разам!».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота аўтара.**

## ТРАЙНОЕ ЗАБОЙСТВА І ВЫКРАДАННЕ ДЗІЦЯЦІ ЎЧЫНЕНЫЯ Ў ГРОДНЕ

**У Гродне ўчынена трайное забойства і выкрадзена дзіця. Пра гэта паведаміў старшы памочнік пракурора Гродзенскай вобласці Вячаслаў Ігнацік.**

У цяперашні час інфармацыі па справе няшмат. Трагедыя разыгралася ўчора ноччу ў адным са шматпавярховых дамоў па вуліцы Кабяка. Вядома, што былі забітыя пенсіянер, яго нявестка і яе сяброўка. Акрамя таго, злачынцы выкралі дзіця забітай жанчыны (унука забітага), 11-гадовага хлопчыка, а кватэру падпалілі. Выратавальнікі, якія прыбылі на пажар, і знайшлі забітых са слядамі нажавых раненняў.

Паводле слоў Вячаслава Ігнаціка, супрацоўнікам праваахоўных органаў у выніку комплексных вышуковых мерапрыемстваў удалося да раніцы затрымаць падазроных. Імі былі два раней судзімыя мужчыны 1980 і 1981 года нараджэння. У іх «паслужным спісе» — грабяжы, махлярства, хуліганства з прымяненнем халоднай зброі, разбой. Адзін з іх нядаўна адбываў сямігадовае пакаранне ў папраўчай установе ў Наваполацку, але быў вызвалены па амністыі. У цяперашні час правяраецца іх удзел ва ўчыненні злачынства.

Паведамляецца таксама, што ў падазроных адабрана выкрадзенае дзіця, якое знаходзіцца цяпер у бяспецы.

**Таццяна ВІШНЕЎСКАЯ, БЕЛТА.**

## ...САМЫ РАСПАЎСЮДЖАНЫ ВІД КАРУПЦЫІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Што датычыць у цэлым карупцыі, то яе ў краіне становіцца з кожным годам усё менш, паведаміў Віктар Конан. Прывёў такую статыстыку. З 2003 па 2008 год няўхільна зніжаецца колькасць карупцыйных злачынстваў. Іх сёлета за 9 месяцаў зарэгістравана на 20 % (470 злачынстваў) менш, чым летась. Гэта зніжэнне Віктар Конан нават назваў прарывам у дзейнасці праваахоўных органаў, у тым ліку і пракуратуры.

Аднак сёлета выяўлена на 42 % больш раскраданняў дзяржаўнай маёмасці, на 63 % — злоўжыванняў службовым становішчам, на 20,5 % — службовых падробак. Удзельная вага карупцыйных злачынстваў характарызуецца наступнымі звесткамі: лідзіруе па-ранейшаму хабар, сярод іншых карупцыйных спраў ён складае 31 %, крадзеж маёмасці — 30 %, далей ідуць службовыя падробкі — крыху менш за 30 %, на чацвёртым месцы — злоўжыванне ўладай ці службовымі паўнамоцтвамі. Да адказнасці за карупцыйныя злачынствы сёлета прыцягнута 891 асоба, летась — 1036. Больш за ўсё парушальнікаў прыцягнута за крадзеж маёмасці — 300 чалавек.

Найбольшая колькасць карупцыйных злачынстваў выяўлена ў гандлі — 18 %, у прамысловасці — 12 %, у сельскай гаспадарцы — амаль 11%, у сферы дзяржаўнага кіравання — 11 %, у будаўніцтве — амаль 9 %, у сферы адукацыі — больш за 6 %, на транспарце — 4 %.

Апошнім часам таксама палепшылася рэальнае кампенсаванне страт, якія ўзніклі ў выніку карупцыйнай злачыннай дзейнасці. Сёлета гэта лічба складае 3,9 мільярда рублёў.

Разам з тым пэўныя дасягненні ў барацьбе з карупцыяй — не падстава для супакойвання, лічыць Віктар Конан. У найбліжэйшыя дні мяркуецца правядзенне чарговай рэспубліканскай нарады па барацьбе са злачыннасцю, дзе будзе, у прыватнасці, разгледжана і пытанне аб выкананні антыкарупцыйнага заканадаўства, мяркуецца распрацаваць дадатковыя меры барацьбы з гэтым злом.

**Леанід ТУГАРЫН.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## САМАЗВАЛЫ ВАДЫ НЕ БАЯЦЦА!..

**Паблізу гарадскога пасёлка Радашковічы ў канале, які вядзе да вёскі Вязынка апынуўся самазвал. Што здарылася з аўтамабілем і як ён апынуўся ў вадзе, высвятляць кампетэнтныя органы.**

### ДЗЕ БЫЎ ВАРТАЎНІК?

Высвятляе праверка па факце падпалу ў вёсцы Наркаўшчына Кармянскага раёна. Пажар адбыўся ў дзве гадзіны ночы на сенаскладзе СПК «Дубровіцы». Агнём знішчана 100 тон сена, а таксама шыферны дах пабудовы з бетону.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### САБРАЦЬ УРАДЖАЙ КАНОПЛЯЎ

не выпала яе сейбітам, бо поле каля вёскі Селішча Пінскага раёна заўважылі супрацоўнікі міліцыі.

А плантацыя культуры, якая мае наркатычныя ўласцівасці, займала каля 500 квадратных метраў. Атрутнае зелле знішчана.

**Яна СВЕТАВА.**


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
### ГОСУДАРСТВЕННОЕ ПРОИЗВОДСТВЕННОЕ ОБЪЕДИНЕНИЕ «МИНСКСТРОЙ»

**220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А**
**режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв с 13.00 до 14.00,**
**тел.: 227 52 36, 226 03 01, 227 50 64**

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2008 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, ул. Есенина д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-3 (жилой дом № 12)» в г. Минске.**

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Здание жилого дома запроектировано из одной двадцатитрехэтажной секции. Количество жилых помещений жилого дома – 137.

Начало строительства – октябрь 2009 года.
Окончание строительства – декабрь 2010 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке:

- государственную экспертизу от 26.05.2009 года № 1163-5/09;
- государственную экологическую экспертизу 22.09.2006 года № 311.

Свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 29.09.2009 г. № 500/1035-957.

Земельный участок площадью 0.067 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться как с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, так и с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить.

Стоимость строительства 1 кв. метра жилых помещений без отделочных работ в текущих ценах составляет – 3 094 340 руб.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 04.09.2009 № 170.

Информацию о строительстве жилого дома и объектах долевого строительства можно получить в каб. 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

**Генеральный директор Е.И. Вовна**



## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ПАЛЛУКС»!
### 29 ОКТЯБРЯ 2009 ГОДА СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ПАЛЛУКС»

**Повестка дня собрания:**

1. Об аннулировании выкупленных акций, числящихся на балансе Общества.
2. Об уменьшении уставного фонда Общества.
3. О внесении изменений в Устав Общества.
4. О передаче полномочий Наблюдательному совету на утверждение регламента работы акционерного общества с реестром владельцев ценных бумаг.

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Воронянского, 17.

С материалами, подготовленными к внеочередному собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Воронянского, 17 (отдел кадров) с 23 по 29 октября 2009 года в рабочие дни с 9.00 до 17.00).

Регистрация участников собрания с 14.00 до 14.45 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания в 15.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 20 октября 2009 года.

Для регистрации при себе иметь: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 100736514 **Наблюдательный совет.**



## УПРАВЛЯЮЩИЙ РПУП «ИППК-ВЕКТОР»
# ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
### ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА РПУП «ИППК-ВЕКТОР»:

**Лот № 2:** здание аппаратной 215,2 кв.м, Борисовский район, п. Светлая Роща, оборудование. Начальная цена с НДС — 48 091 003 белорусских рубля. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 07.07.2009 г. Подробный перечень имущества, входящего в состав лота, оговорен в условиях проведения аукциона. Аукцион состоится **30.10.2009 г.** в 12.00 по адресу: Борисовский район, поселок Светлая Роща. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.10.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (80177) 74 84 42, (8029) 57 555 40.** УНП 690033599

